**НАВІНКІ КНІГАВЫДАННЯ**




# НІКОЛІ НЕ БУДУЦЬ ЗАБЫТЫЯ…

**Паважаныя сябры, паведамляем вам пра тое, што кніжная скарбніца Прынёманскага краю папоўнілася новым выданнем на тэмы 80-годдзя Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне і захавання памяці пра гэта. Аўтар доўгачаканай кнігі, зборніка нарысаў і вершаў «Я з таго пакалення» ганаровы член СПБ Браніслаў Ермашкевіч.**

Новая праца Браніслава Іосіфавіча канцэптуальна завяршае ваенна-патрыятычную кніжную трылогію гродзенскага літаратара. У анатацыі да новага выдання яго аўтар паведамляе: «Кніга «Я з таго пакалення» прысвячаецца 80-годдзю Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне і апавядае пра нашу прыналежнасць да вялікага праз адчуванне штодзённага – абароны Айчыны і захавання памяці пра наша гераічнае мінулае. Яна з'яўляецца той часткай, якая ў спалучэнні з раней напісанымі («Водсвет далёкіх дзён» і «Памяць патрэбна жывым»), завяршае вобраз майго трохкніжжа, дзе кожная з іх адлюстроўвае значныя вехі ў гісторыі роднага краю».

Змест кнігі складаецца з раздзелаў: «Героі Савецкага Саюза і Беларусі з Гродзеншчыны»; «Іх імёнамі названы вуліцы»; «З Кнігі Славы Гродзенскай вобласці»; «З Кнігі Славы горада Гродна»; «Яго імем названа бібліятэка ў горадзе Гродна»; «Ім устаноўлены мемарыяльныя дошкі»; «Вершы». Выданне багата ілюстравана фотаздымкамі з архіваў і адкрытых крыніц. Аўтар выказвае падзяку старшыні выканаўчага камітэта Гродзенскага раёна В. У. Хелскаму, старшыні СВК «Азёры Гродзенскага раёна» А. М. Шымко і дырэктару ГАУПП «Лідская друкарня» М. М. Пякарскаму за аказаную дапамогу ў выданні кнігі. На тыльным баку вокладкі размяшчаюцца фотапартрэт Б. І. Ермашкевіча і яго кароткая творчая біяграфія. У кнізе 168 старонак. Тыраж 100 экзэмпляраў. Пераплёт цвёрды. Выдавец і паліграфічнае выкананне: Гродзенскае абласное ўнітарнае паліграфічнае прадпрыемства «Лідская друкарня».

**САЮЗ ПІСЬМЕННІКАЎ БЕЛАРУСІ**
**ГРОДЗЕНСКАЕ АБЛАСНОЕ АДДЗЯЛЕННЕ**

# АД АЎТАРА

Непрыкметна праляцелі 80 гадоў з таго часу, як Савецкімі Узброенымі Сіламі былі разгромлены нямецка-фашысцкія войскі, абаронены гонар і незалежнасць Радзімы. Даўно «...пазарасталі сцежкі вузкія...» на мясцінах руін і папялішчаў, пакінутых нам фашыстамі. Сёння ажыўлены вёскі, выраслі новыя кварталы ў гарадах. Там, дзе былі вогненыя пераправы, узвышаюцца новыя сучасныя масты, адноўлены старыя, пабудаваны новыя аўтастрады. Мінула шмат часу, але ніколі не будуць забытыя імёны тых, хто ў цяжкую для нашай Радзімы гадзіну здзейсніў бяспрыкладны подзвіг, хто не пашкадаваў жыцця дзеля цяперашніх пакаленняў. Вось і зараз гэтая кніга «Я з таго пакалення» зойме адпаведнае месца сярод раней напісаных: «Водсвет далёкіх дзён» (2015) і «Памяць патрэбна жывым» (2018). Новая кніга ўключае жыццяпіс ваенных дзеячаў Савецкай Арміі, якія абаранялі і вызвалялі не толькі горад Гродна. Даследаванне выйшла далёка за межы горада над Нёманам. Гэта экскурс у мінулае Гродзеншчыны для яшчэ большага знаёмства з людзьмі, якія ў суровыя гады вайны адстаялі нашу Радзіму. Зборнік «Я з таго пакалення» мае мэту зберагчы памяць пра мінулае, пра тое, за што змагаліся нашы бацькі. Гэта яны атрымалі высокую адзнаку грамадства і ўвекавечаны ў помніках, мемарыялах, назвах вуліц, навучальных устаноў, у Кнігах Славы горада Гродна і вобласці, сталі Ганаровымі грамадзянамі.

Прыклад герояў Вялікай Айчыннай вайны пераймаюць новыя пакаленні беларусаў. Сваёй плённай працай яны ў мірны час узбагачаюць скарбонку Беларусі. Чытач кнігі адкрые для сябе раней невядомыя эпізоды з жыцця сваіх землякоў, пісьменнікаў, мастакоў і музыкаў. Кніга «Я з таго пакалення», як і «Водсвет далёкіх дзён», і «Памяць патрэбна жывым» – аповед пра нашу прыналежнасць да вялікага праз адчуванне штодзённага. Аб'ектыўнае ўспрыманне рэчаіснасці магчыма пры дасягненні двух мэтаў, як адзінага цэлага – абароны Айчыны і захавання памяці пра наша гераічнае мінулае.

Паважаны чытач з'яўляецца сведкай нараджэння ўнікальнай мастацкай з'явы– трылогіі. З маіх успамінаў, думак пачуццяў паўстае вобраз трохкніжжа, дзе кожная кніга – адлюстраванне значнай вехі ў гісторыі роднага краю. Мае надзеі на мірную будучыню звязаны з актыўнай патрыятычнай пазіцыяй чытача.

У другой частцы апошняй кнігі трылогіі пра вайну і мірную працу, кнігі-паклікання, кнігі-дыялогу, змяшчаюцца вершы якія прысвячаю 80-годдзю Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне.

**Браніслаў ЕРМАШКЕВІЧ**








**Вокладкі кніг «Водсвет далёкіх дзён» (2015); «Памяць патрэбна жывым» (2018) і «Я з таго пакалення» (2026), якія складаюць ваенна-патрыятычную трылогію ганаровага члена Саюза пісьменнікаў Беларусі Браніслава Ермашкевіча**